– детей (глава II, ст. 13);
– детей, нуждающихся в санаторно-курортном лечении (глава II, ст. 14);
– малообеспеченных семей, имеющих детей (глава III);
– работников организаций социального обслуживания Республики Марий Эл (глава IV, ст. 24).

**Заключение.** Повышение уровня жизни населения — основная цель социальной политики и главный критерий ее эффективности в любой цивилизованной стране. Сокращение масштабов бедности выступает в качестве одной из важнейших составляющих достижения этой цели. А бедность ведет к ухудшению качественных характеристик населения, усилению социально-экономического неравенства, что чревато социальными катаклизмами. По мнению авторов, для решения этих жизненно важных вопросов следовало бы принять следующие меры:

1) содействие росту занятости и повышению уровня оплаты труда (в отношении трудоспособных);

2) создание условий для самообеспечения нормального уровня благосостояния всех семей с трудоспособными взрослыми на трудовой основе;

3) формирование системы эффективной поддержки уязвимых групп населения (престарелые, инвалиды, семьи с высокой иждивенческой нагрузкой, семьи в экстремальных ситуациях) и гарантий недискриминационного доступа к бесплатным ресурсам;

4) сосредоточивание усилия на снижении в два раза уровня бедности в тех регионах, в которых проживает не менее чем 50% всего бедного населения страны;

5) создание социальных программ, помогающих снизить уровень бедности.

**Список цитируемых источников**

1. *Сычева, В. С.* Измерение уровня бедности: история вопроса / В. С. Сычева // СОЦИС. — 2008. — № 3. — С. 22.

2. *Перова, М. Б.* Словарь терминов по социальной статистике. Ключевые термины статистической науки в социологическом аспекте : учеб. пособие / М. Б. Перова, Е. В. Перов ; М-во образования Рос. Федерации ; Волог. гос. техн. ун-т. — 3-е изд., доп. — Вологда : ВоГТУ, 2003. — 100 с.

3. *Ярошенко, С.* Теоретические модели бедности / С. Ярошенко // Рубеж. — 1996. — № 8—9.

4. Об установлении величины прожиточного минимума на душу населения и по основным социально-демографическим группам населения в целом по Российской Федерации за IV квартал 2016 г. : постановление Правительства Рос. Федерации от 1 дек. 2016 г. № 1275 // КонсультантПлюс. Россия / ЗАО «КонсультантПлюс». — М., 2016.

5. Об установлении величины прожиточного минимума на душу населения и по основным социально-демографическим группам населения в Республике Марий Эл за IV квартал 2016 г. [Электронный ресурс] : постановление Правительства Респ. Марий Эл № 15 от 23 янв. 2017 г. — Режим доступа: http://www.garant.ru/hotlaw/mariel/1092697/ . — Дата доступа: 12.12.2016.

6. Об установлении бюджета прожиточного минимума в среднем на душу населения и по основным социально-демографическим группам населения в ценах декабря 2016 года в расчете на месяц [Электронный ресурс] : постановление М-ва труда и соц. защиты Респ. Беларусь от 19.01.2017 № 3 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. — 28.01.2017. — 8/31711.

УДК 930(476)(092)

**Д. І. Кузьма**
*Установа адукацыі «Дзятлаўскі раённы вучэбна-метадычны кабінет», Дзятлава*

## УПЛЫЎ М. В. КАЯЛОВІЧА НА ЎРАДАВУЮ ПАЛІТЫКУ Ў ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

**Уводзіны.** Асоба М. В. Каяловіча да нашага часу выклікае шмат супярэчлівых адзнак. Будучы вучоны нарадзіўся ў сям'і ўніяцкага святара на беларуска-польскім памежжы. За доўгія гады даследчыцкай, публіцыстычнай і выкладчыцкай працы ён набыў значны аўтарытэт у навуковым, палітычным і грамадскім асяроддзі. Да яго меркавання прыслухоўваліся вышэйшыя чыноўнікі Расійскай імперыі і прадстаўнікі інтэлігенцыі беларуска-літоўскіх губерняў.

**Асноўная частка.** Пасля заканчэння вучобы ў Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі М. В. Каяловіч застаўся працаваць у гэтай навучальнай установе. Ён прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці сталіцы. Выкладчык падтрымліваў кантакты з уплывовымі грамадскімі дзеячамі, чыноўнікамі, літаратарамі. Напрыклад, ён быў добра знаёмы з пісьменнікам Ф. М. Дастаеўскім, які збіраўся надрукаваць адзін з яго артыкулаў у сваім выданні «Эпоха», але пры гэтым не пагаджаўся з некаторымі высновамі вучонага аб руска-польскіх узаемаадносінах. Каяловіч узгадваў творчыя дасягненні вядомага пісьменніка ў сваім выступленні пры абароне адной з магістарскіх дысертацый у духоўнай акадэміі [1, с. 535].

Гісторык прымаў актыўны ўдзел у вывучэнні беларускіх губерняў і папулярызацыі звестак аб іх мінулым і сучасным стане. У 1862 годзе на працягу Вялікага посту М. В. Каяловіч чытаў лекцыі па гісторыі брацкага руху ў Рэчы Паспалітай. Выступленні вучонага адбываліся па серадах у доме этнографа П. М. Бацюшкава і збіралі шмат прадстаўнікоў вышэйшага сталічнага грамадства, пераважна жанчын і духоўных асобаў. Усяго

© Кузьма Д. І., 2017

Репозиторий БарГУ

з 28 лютага да 28 сакавіка адбылося пяць лекцый, падчас якіх М. В. Каяловіч расказваў аб гісторыі і сучасным становішчы брацтваў, значэнні іх аднаўлення і ўмацавання для заходніх губерняў. Адна з фрэйлін жонкі імператара Марыі Аляксандраўны Г. Ф. Цютчава занатавала ў сваім дзённіку, што яна ў тыя часы наведвала выступленні М. В. Каяловіча, на іх жа 7 сакавіка прысутнічала яе сястра Марыя і іх бацька, вядомы паэт Ф. І. Цютчаў. У сакавіку 1862 года пабываў на лекцыях гісторыка і міністр унутраных спраў Расійскай імперыі П. А. Валуеў. Аб М. В. Каяловічы ён запісаў у сваім дзённіку такія словы: «Надзвычайны дар слова, але неапрацаваны, не ўдасканалены, бестактоўны, як амаль усе ў нас таленты» [2, с. 152]. Таксама па запісах гэтага чыноўніка можна прасачыць, які ўплыў аказвалі асобы з блізкага акружэння на саму імператрыцу. Міністр пісаў, што погляды Марыі Аляксандраўны не выходзілі з кола графіні А. Д. Блудавай, фрэйліны Г. Ф. Цютчавай, А. П. Ахматава і інш. Пры гэтым чыноўнік адзначаў, што жонка імператара мела вялікі, на яго думку, часта негатыўны уплыў на дзяржаўныя справы. Аляксандр II перыядычна прыслухоўваўся да прапаноў Марыі Аляксандраўны.

У гэты час у Вільні пашыраліся прапольскія настроі. У якасці меры супрацьдзеяння «рускія» дзеячы, якія былі прадстаўлены праваслаўным духавенствам, часткай мясцовага чыноўніцтва і інтэлігенцыі, імкнуліся ўзмацніць праваслаўе, прапануючы адчыніць праваслаўную духоўную акадэмію. Яны ж у маі 1862 года распрацавалі праект стварэння археаграфічнай камісіі. Улічваючы, што пазней М. В. Каяловіч актыўна сачыў за дзейнасцю гэтай арганізацыі і даваў карысныя парады па далейшаму паляпшэнню яе працы, то можна выказаць меркаванне, што ён меў дачыненне да яе стварэння і напісання плана арганізацыі даследаванняў. Такім чынам, можна прасачыць значны ўплыў вучонага на працэс функцыянавання і, магчыма, заснавання дадзенай камісіі, працы якой спрыялі актывізацыі даследавання беларускай гісторыі.

Гісторык меў зносіны з генерал-губернатарам У. І. Назімавым і апякуном Віленскай навучальнай акругі князем А. П. Шырынскім-Шыхматавым. На знаёмства М. В. Каяловіча з гэтымі прадстаўнікамі ўлады ўказваў А. Цвікевіч і нават пісаў, што апошні з іх у сваіх данясеннях у Пецярбург часта «спасылаўся на аўтарытэт М. В. Каяловіча як знаўцы Беларусі» [3, с. 156]. У адным з дакументаў, прызначаных міністру народнай асветы А. В. Галаўніну, Шырынскі-Шыхматаў пісаў, што да справы дэпаланізацыі рэгіёну варта было б прыцягнуць гэтага прафесара духоўнай акадэміі як чалавека, які «грунтоўна вывучыў на месцы мінулае і сучаснае краю» [4, с. 16]. Акрамя таго, прадугледжвалася за кошт рэштак фінансавых сродкаў, якія выдзяляліся для набыцця вучэбнай літаратуры ў акрузе, арганізаваць пакупку нядаўна выдадзенага даследавання «Літоўская царкоўная унія» М. В. Каяловіча. Там жа апякун пісаў аб неабходнасці выдання спецыяльнай кнігі для чытання, прызначанай «простаму народу», і аб патрэбе аднаўлення дзейнасці праваслаўных брацтваў. А М. М. Улашчык адзначаў, што ні У. І. Назімаў, ні А. П. Шырынскі-Шыхматаў не ведалі гісторыі Беларусі і Літвы, на той час амаль не было даследаванняў, дзе мінуе рэгіёну было б пададзена з «рускага» пункту гледжання.

У маі 1862 года мітрапалітам Іосіфам Сямашкам былі заснаваны «Літоўскія епархіяльныя ведамасці». Першы нумар гэтага часопіса выйшаў 15 студзеня 1863 года і змяшчаў спецыяльны, можна сказаць «праграмны» артыкул М. В. Каяловіча са зваротам да праваслаўнага духавенства. Верагодна, М. В. Каяловіч, які ўжо пачаў друкавацца ў сталічных рэлігійных і свецкіх выданнях і быў добра знаёмы з іх спецыфікай, мог параіць пастарэламу Іосіфу Сямашку стварыць такі орган перыядычнага друку. Нездарма, каб прывабіць чытачоў, першы нумар выдання змяшчаў артыкул досыць вядомага на той час і аўтарытэтнага выкладчыка Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі М. В. Каяловіча.

У канцы 1860 гадоў пасля сканчэння працы ў якасці апякуна Віленскай навучальнай акругі І. П. Карнілаў арганізоўваў на сваёй кватэры ў сталіцы Расійскай імперыі сустрэчы для асобаў, «выступаючых супраць палякаў». Там бывалі: М. В. Каяловіч, літаратурны крытык А. В. Нікіценка, чыноўнік з Варшавы П. К. Шчэбальскі, кіраўнік Віленскай археаграфічнай камісіі Я. Ф. Галавацкі і інш. Прыезджыя па справах у Санкт-Пецярбург настаўнікі з заходніх губерняў пастаянна наведвалі І. П. Карнілава і расказвалі аб тым, што тварылася ў Віленскай навучальнай акрузе [5, с. 5].

Адзначым, што М. В. Каяловіч выступаў за павелічэнне кантролю з боку ўладаў за каталіцкай царквой і аслабленне ўплыву Папы Рымскага. Гісторыку не падабалася спалучэнне рэлігійных і палітычных элементаў у каталіцтве. Напрыклад, у 1865 годзе ён крытыкаваў правядзенне шматлюдных працэсій, прысвечаных святу Божага цела.

У 1864 годзе М. В. Каяловіч рыхтаваў спецыяльныя запіскі для міністра народнай асветы А. В. Галаўніна і апякуна Пецярбургскай навучальнай акругі І. Д. Дзялянава. Верагодна, гэтыя дакументы былі прысвечаны стану адукацыі ў беларуска-літоўскіх губернях. У гэтым жа годзе падчас асабістай сустрэчы гісторык рэкамендаваў мастаку Д. Струкаву надрукаваць разам з тэкстам малюнкі, звязаныя з беларускімі тэрыторыямі, і прыцягнуць да гэтай справы П. М. Бацюшкава [6, арк. 7].

Да самай смерці ў 1891 годзе М. В. Каяловіч актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці беларускіх зямель. У шматлікіх некралогах сучаснікі пазітыўна ацэньвалі яго ролю ў развіцці гэтых тэрыторый. Яны адзначалі, што з такой стратай не было больш каму «ў друку і вусна прапаведаваць, што заходнярускі народ неабходна толькі агароджваць ад варожых і шкодных уплываў, ахоўваць ад прыгнёту іншапляменага, чужаземнага, і што затым ён сам правільна, роўна пойдзе па шляху, вызначаным яму гісторыяй» [7, с. 282]. Вучань гісторыка П. М. Жуковіч пісаў, што думкі і сэрца М. В. Каяловіча заўсёды былі звернуты да Беларусі, а гэтая смерць пазбавіла многіх людзей «духоўнага правадыра» [8, с. 289].



Рэпазіторый БарДУ

**Заключэнне.** Значную частку грамадскай актыўнасці М. В. Каяловіча займалі справы, звязаныя з мінулым і сучасным беларускіх зямель. Ён выкарыстоўваў сваё становішча, сувязі, грунтоўныя гістарычныя веды, каб уплываць на дзеянні чыноўнікаў у тым кірунку, які лічыў правільным. Да меркавання знакамітага вучонага прыслухоўваліся вышэйшыя службовыя асобы краіны, высока цанілі яго дзейнасць прадстаўнікі імператарскай сям'і.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Летопись жизни и творчества Ф. М. Достоевского. 1821—1881 : в 3 т. / сост. А. В. Архипова [и др.]. — СПб. : Ин-т рус. лит. (Пушкин Дом) Рос. акад. наук. — 1995. — Т. 3. — 614 с.
2. *Валуев, П. А.* Дневник П. А. Валуева, министра внутренних дел : в 2 т. / П. А. Валуев ; под ред. П. А. Зайончковского. — М. : Изд-во Акад. наук СССР, 1968. — Т. 1 : 1861—1864 гг. — 422 с.
3. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм» : Нарысы з гісторыі грамадзкай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч ; пасляслоўе А. Ліса. — 2-е выд. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 352 с.
4. *Ширинский-Шихматов, А. П.* Представление кн. Ширинского-Шихматова управляющему Министерством народного просвещения А. В. Головину от 14 апр. 1862 г. за № 24 об особенностях С.-Западного края, вызывающих соответственные особенности народной школы / А. П. Ширинский-Шихматов // Русское дело в Северо-западном крае : материалы для истории Виленского учебного округа преимущественно в Муравьевскую эпоху / И. Корнилов. — СПб. — 1901. — С. 13—23.
5. *Жиркевич, А. В.* Сонное царство великих начинаний / А. В. Жиркевич. — Вильна : Рус. почин, 1911. — 206 с.
6. *Струков, Д. М.* Письмо к И. И. Срезневскому от 20 марта 1864 г. / Д. М. Струков // Аддзел рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (АР РНБ). — Фонд 734. Воп. 1. Спр. 42. Л. 7.
7. *Григорович, И.* Некролог М. О. Кояловича / И. Григорович // ЛЕВ. — 1891. — № 35. — С. 282—283.
8. *Жукович, П. Н.* Речь преподавателя Литовской духовной семинарии П. Н. Жуковича / П. Н. Жукович // ЛЕВ. — 1891. — № 36. — С. 289—290.


УДК 37:930(476)

**С. В. Кулагин**
*Государственное учреждение образования «Средняя школа № 2 г. Ляховичи», Ляховичи*

## СТАНОВЛЕНИЕ ОБЩЕСТВА: ПРОШЛОЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ

**Введение.** Человек или общество? История или современность? Или же и человек в обществе, и жизнь в современности, не забывая о прошлом? Эти вопросы мучили и продолжают мучить социологов и философов на протяжении уже целых веков или даже тысячелетий. Сегодня, живя в прекрасное время многочисленных достижений науки с почти неисчерпаемыми возможностями для мгновенного общения с кем угодно, когда угодно и где угодно, у нас есть возможность наконец ответить на эти вопросы и оставить нашим потомкам возможность для изучения других не менее важных вопросов. Как многим известно, положение всех людей в обществе разное. В первую очередь по материальному статусу. Согласно закону Парето 20% всех людей обладают 80% объёма общественных материальных благ. Верно и обратное: остальные 80% людей обладают всего лишь 20% материальных благ. И тут встает вопрос: одинаковое ли положение богатых и бедных. Нет. Опять же согласно закону Парето около 20% людей имеют около 80% власти в обществе [1]. Одинаковое ли положение занимает власть имущих и власть неимущих? Нет. Резонный вопрос тогда появляется: для каких людей нам изучать положение человека в обществе, в истории, в современности. Для маленькой кучки владельцев власти и денег, ведь, как известно, где власть, там и деньги, или же для благородного большинства? Если углубляться в эту тему, то встанут вопросы другого типа, может, даже более существенные. Например, что важнее: человек или само общество? Если перед человеком встанет выбор положить свою жизнь на алтарь служения обществу или посвятить свою жизнь себе, счастью и процветанию [2]. Какой выбор будет правильным? Смотря с какой точки зрения взглянуть на представленную картину. Если со стороны бесчувственного общества, то, конечно, общественная жизнь есть то, чего только может желать человек, но если посмотреть на ту же ситуацию со стороны обычного индивида, то тут совсем другая картина. Спросите себя: сколько минут на прошлой неделе вы были счастливы? Заметьте: минут, не часов, не дней, а всего лишь жалких минут. Хотели бы вы это изменить? Хотели бы, чтобы ваша жизнь была полна счастья каждую секунду? Ответ на два предыдущих вопроса и будет ответом на дилемму: жизнь на алтаре общества, или же жизнь для счастья, своего счастья [3]. Теперь во время многих бесед между несколькими социальными существами можно услышать фразу: «Раньше было лучше». А действительно ли это так? На этот вопрос был дан ответ самым великим человеком за всю историю человечества, самим Никколо ди Бернардо Макиавелли. В его классическом труде «Рассуждение о первой декаде Тита Ливия» ответ на этот вопрос был дан в главе 39. Люди склонны преувеличивать достижения и жизнь людей раньше и преуменьшать положение людей и качество жизни сейчас, так как все хорошие деяния прошлого люди склонны воспевать и забывать о неудобствах и плохих деяниях. В то же время те же люди очень остро воспринимают негативные моменты их

© Кулагин С. В., 2017

Репозиторий БарГУ